# 7 АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ФИЛОЛОГИИ И МЕТОДИКИ ПРЕПОДАВАНИЯ ЯЗЫКА И ЛИТЕРАТУРЫ

***Н. І. Валчок***
Навуковы кіраўнік — *В. М. Шавель*
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

## ПАРАЎНАННЕ Ў РАМАНТЫЧНЫХ ПАЭМАХ ЯНКІ КУПАЛЫ: ЗНАЧЭННЕ, СПОСАБЫ ЎВЯДЗЕННЯ Ў КАНТЭКСТ, ЧАСЦІНАМОЎНАЕ ВЫРАЖЭННЕ

Даследчыкі моўнай арганізацыі твораў Янкі Купалы адзначаюць параўнанні як неад’емны і значны элемент рамантычных паэм. Пісьменнік ужывае іх як адзін з актыўных сродкаў рэалізацыі ідэйна-мастацкай задумы; яны выяўляюць істотныя бакі вобразна-асацыятыўнага мыслення пісьменніка, выконваюць складаную мастацка-эстэтычную функцыю. Ва ўзаемадзеянні з іншымі моўнымі сродкамі ў кантэксце параўнанні набываюць дадатковыя сэнсавыя і стылістычныя адценні [1, с. 157].

Асноўная функцыя параўнальных зваротаў — «супаставіць, параўнаць якасці, уласцівасці, дзеянні паяснёнага прадмета, асобы з іншымі прыметамі, дзеяннямі. Супастаўляючы тыя ці іншыя з’явы, прадметы, прыметы і дзеянні, аўтар з дапамогай параўнання можа іх наглядна адлюстраваць, больш дакладна ахарактарызаваць, даць ім вобразнае азначэнне для таго, каб найбольш поўна паказаць прадмет параўнання» [2, с. 42].

Параўнанні, выкарыстаныя ў рамантычных паэмах Я. Купалы, паводле значэнняў, якія яны маюць, можна раздзяліць на некалькі семантычных груп. Найбольш пашыраны ў мове паэм параўнальныя канструкцыі, лексічнымі напаўняльнікамі якіх выступаюць найменні [3, с. 116]:

- прыродных з’яў, напрыклад: Задзіўляе ўсіх чыста, / *Як зара якая* [4, с. 68]; У вочках толькі рдзяцца слёзы, / *Як улетку росы* [4, с. 72]; Машэка жыў з сваёй сям’ёю, — / Не жыў, а блукаўся, *як цьма* [4, с. 87] і інш.;
- жывёл, напрыклад: Натуру меў ён залатую, / *Як бы ягнём*, патульны быў [4, с. 80] і інш.;
- дрэў, раслін, напрыклад: І стаіць яна прад панам, / *Як каліна тая*; Павалілась на зямельку, / *Як бярозка бела* [4, с. 72]; Парасплеценыя косы, / *Як тыя галінкі,* / Леглі пасмамі хваліста / Тут жа ля дзяўчынкі [4, с. 75 ]; Павеўна, *як даспелы колас*, / Ішла наперад у танок, / З грудзей гарачых звонкі голас / Змяняла ў песню — *як званок* [4, с. 83] і інш.;
- асобы, напрыклад: Болей жалю меў над ёю, / *Як якія людзі* [4, с. 70]; Паміж сваімі і чужымі, / *Як страшны імем сваім кат* [4, с. 88] і інш.

Назіранні пацвярджаюць, што часцей у рамантычных паэмах Янкі Купалы выкарыстоўваюцца параўнальныя звароты, якія ўводзяцца ў тэкст з дапамогай злучнікаў *як, быццам, бы, як бы,* напрыклад: *Як маліны*, яе губкі, / А твар, *як лілея*, / *Як дзве зоркі,* яе вочы, / Гляне — свет яснее [4, с. 68]; У куце на лаве, / *Як бы тую маладую / У вясельнай славе* [4, с. 73] і інш. Пры гэтым пераважную большасць складаюць параўнанні са злучнікам *як,* што выражаюць супастаўленне аб’екта і суб’екта на аснове сцвярджальнага характару іх супастаўлення, напрыклад: З плеч сплываюць яе косы, / *Як бы сонца косы*, / І іскрацца, *як на сонцы* / *Брыльянцісты росы* [4, с. 68]; Невыдумная світка — убор на плячах, / Барада, *як снег белы*, — такая [4, с. 53]; Мінута. Ужо стрымаў ён коні, / *Як сноп*, зваліўся ўжо фурман… У вочках толькі рдзяцца слёзы, / *Як улетку росы* [4, с. 89]; Жыццё кіпіць, *як у гаршку* [4, с. 93] і інш. Сустракаюцца адзінкавыя выпадкі параўнанняў са злучнікам *бы,* якія выразна не выяўляюць катэгарычнасці падабенства. Пераважае ў такіх параўнаннях адценне меркавання, няўпэўненасці, напрыклад: Лезе пан да Бандароўны, / Увесь гарыць, *бы ў жары* [4, с. 69]; *Бы тую пёрынку птушыну*, / У сваю бярлогу яе нёс [4, с. 90] і інш.

Прадуктыўнай канструкцыяй сярод бяззлучнікавых параўнанняў у рамантычных паэмах з’яўляецца творны склон назоўніка. Такія параўнанні ў мове паэм набываюць метафарычны характар і выкарыстоўваюцца для вобразнай характарыстыкі герояў і прыродных з’яў [3, с. 113], напрыклад: К маладзіцам і дзяўчатам / Лезе *смоллю* ў жарты [4, с. 69]; Белы хорам стаяў, *недаступнай сцяной* / Грозна, думна глядзеў на прыволле [4, с. 51]; Натальку любую сустрэці, / Аджыць *агнём* яе вачэй [4, с. 84] і інш. Вельмі рэдка сустракаюцца ў мове паэм бяззлучнікавыя параўнанні, выражаныя формай параўнальнай ступені прыслоўя або прыметніка ў спалучэнні з назоўнікам [3, с. 113], напрыклад: Не ўкіне ў цьму, за ноч *цямней*? [4, с. 88] і інш. Таксама зафіксаваны адзінкавыя выпадкі выкарыстання адмоўных параўнанняў, напрыклад: *Не віхор* калыша лесам, / *Не ваўкі* заводзяць, / *Не разбойнікі* гурмою / За дабычай ходзяць [4, с. 67]. У рамантычных паэмах Я. Купалы сустракаюцца параўнанні, выражаныя ўстойлівымі спалучэннямі слоў з адзіным цэласным значэннем — фразеалагізмамі [3, с. 114], напрыклад: Вось настроіў, навёў тон у струнах *як след*, / Не зірнуўшы на гулі ні разу… [4, с. 53]; Што гаварылі, чым ёй кадзіў — / Не варта паўтараці тут, / Але з тых пор, *як па загадзе*, / Ён спадабаў вясковы кут [4, с. 86]; У думках думала няўпынна, / Як ёй разбойніка згубіць, / Якога не магла нявінна / Ужо так, *як некалі*, любіць [4, с. 91] і інш.

Рэпазіторый БарДУ

Сустракаюцца ў паэмах і разгорнутыя параўнанні, якія дапамагаюць перадаць найвышэйшае эмацыянальнае напружанне [3, с. 112], напрыклад: Ты брыльянтамі ўсыпаў атласы і шоўк — / Гэта цёртая сталь ад кайданаў, / Гэта вісельні петляў развіты шнурок, / Гэта, княжа, тваe саматканы [4, с. 54]; Стол ты ўставіў ядой, касцей шмат пад сталом, — / Гэта косці бядноты рабочай; / Пацяшаешся белым, чырвоным віном, — / Гэта слёзы нядолі сірочай [4, с. 55] і інш.

Большасць параўнанняў, выкарыстаных у рамантычных паэмах Я. Купалы, калі параўноўваюцца два прадметы або дзве з'явы паводле адной агульнай прыкметы, складаюцца з аднаго слова, якое з'яўляецца самастойнай часцінай мовы [5, с. 43]. Паводле часцінамоўнай прыналежнасці гэта:

1) параўнанні-назоўнікі, напрыклад: Сонных вёсак шары, хат амшалых, *як мар*, / Хат з сям'ёй душ падданых, пакорных [4, с. 51]; Уся, *як цень*, павеўна, / Як ідзе яна бывала, — / Набок каралеўна! [4, с. 68]; Весць аб смерці Бандароўны / Скрозь пайшла, *як мора*, / Зашумела Украіна — / Гора панам, гора! [4, с. 78] і інш.;

2) параўнанні-прыслоўі, напрыклад: Паміж вольхаў рака, *як штодзень*, не бурліць, / Паплаўкі рыба-плотка хавае… [4, с. 52]; А сягоння выглядае / Лепей, *як заўсёды*… [4, с. 68]; Быў рад сваёй так доўгай згубе, / У нагах з пакораю сядаў, / *Як здаўна*, песціў і галубіў / І словы чулыя складаў [4, с. 90] і інш.;

3) параўнанні, выражаныя субстантываванымі часцінамі мовы, напрыклад: У куце на лаве, / *Як бы тую маладую / У вясельнай славе* [4, с. 73] і інш.;

4) параўнанні-займеннікі, напрыклад: І я сам, *як і ты*, так табе запяю … [4, с. 53]; І на месяц глядзіць, *як сам*, белы [4, с. 56]; Не прадасць яна дзявоцтва, / *Як ты*, пан, сумленне [4, с. 74] і інш.;

У многіх выпадках пры словах, якія складаюць параўнальны зварот, могуць быць залежныя словы. У паэмах Я. Купалы пры словах, якія выражаюць сутнасць параўнання, часцей за ўсё ў якасці залежных выступаюць займеннікі:

1) указальныя, напрыклад: Мёд, віно ў жбанах б'е пенай, / *Як бы мора тое* [4, с. 73]; Парасплеценыя косы, / *Як тыя галінкі, /* Леглі пасмамі хваліста / Тут жа ля дзяўчынкі [4, с. 75]; Машэка *гэтакі асілак*, / Што рваў дзярэўе з каранём, / У руках яе стаў *як апілак*: / Яго забрала хараством [4, с. 82] і інш.

2) няпэўныя, напрыклад: Аб ёй людзі гаварылі, / *Як аб нейкім цудзе* [4, с. 68];

3) адносныя, напрыклад: Задзіўляе ўсіх чыста, / *Як зара якая* [4, с. 68]; *Як распусніцу якую/ Ці як чараўніцу* [4, с. 72] і інш.

Развітыя параўнанні ўтвараюцца і спалучэннямі:

1) назоўнік + займеннік + прыметнік ці дзеепрыметнік, напрыклад: Жыццё з ім цешыць не магло, / *Як тую грэшную русалку* — / Жывыя людзі і святло [4, с. 90]; Забіралі бацька, маці / Родную дачушку, / Неслі ціха, асцярожна / *Сваю мёртву služку* [4, с. 76] і інш.;

2) назоўнік + прыметнік ці дзеепрыметнік, напрыклад: Палыны ўзышлі, вырас дуб малады, / Зашумеў *непамятлівым словам* [4, с. 56]; Павеўна, *як даспелы колас*, / Ішла наперад у танок, / З грудзей гарачых звонкі голас / Змяняла ў песню — *як званок* [4, с. 83] і інш.;

3) назоўнік + назоўнік, назоўнік + назоўнік з прыназоўнікам, напрыклад: Шукае, *як канюх расы* [4, с. 84]; І блішчэла па ўсёй сцежцы, / *Як раса на полі* [4, с. 76]; Вілі ў дамоўку, / *Як карону каралеўне*, / Клалі на галоўку [4, с. 76];

4) назоўнік + прыслоўе, напрыклад: У вочках толькі рдзяцца слёзы, / *Як улетку росы* [4, с. 72] і інш.

Параўнанні выражаюцца ў паэмах і склонавымі формамі назоўнікаў, напрыклад: На вяселле-разгул наплыло, *як на сход*, / Госці знатных зусюль, за паўсвету… [4, с. 52]; Прыбіралі, *як да шлюбу*, / У белю і вэлёны, / Заплятаді буйны косы / У каснікі чырвоны [4, с. 76]; Што гаварылі, чым ёй кадзіў — / Не варта паўтараці тут, / Але з тых пор, *як па загадзе*, / Ён спадабаў вясковы кут [4, с. 86]; Над ёю з часам дрэвы палі, / І горад вырас, *як з зямлі*, / Яго Магілёвам назвалі, /Бо йнакш прыдумаць не маглі [4, с. 93] і інш.

Праведзены аналіз выкарыстаных у рамантычных паэмах Я. Купалы параўнанняў паказвае, што найбольш ужывальнымі з'яўляюцца неразвітыя параўнанні-назоўнікі. На другое месца ўмоўна можна паставіць параўнанні-назоўнікі развітыя займеннікамі.

Дасканалае веданне вобразных магчымасцей слова дазваляе пісьменніку пры дапамозе параўнання стварыць непаўторныя індывідуальныя характарыстыкі персанажаў [1, с. 161]. Часам для характарыстыкі героя Янку Купалу дастаткова аднаго параўнання, якое дае агульнае ўяўленне пра чалавека: Сэрца маеш, *як гэты цагляны парог* / І душу — як скляпоў гэтых сховы [4, с. 54]. Невялікая падборка параўнанняў, што характарызуюць чалавека, паказвае, з якой увагай ставіцца Янка Купала да гэтых вобразных сродкаў. Прадуманае параўнанне дапамагае лаканічна, адным словам перадаць стан чалавека, асаблівасці яго характару, паводзін, манеры гаварыць і г. д. [1, с. 164]: Князь у хораме жыў, слаўны свету ўсяму / Недаступны і грозны, *як хорам* [4, с. 51] і інш.

Аналіз параўнальных канструкцый, выбраных з рамантычных паэм Янкі Купалы, дае падставу сцвярджаць: купалаўскія параўнанні разнастайныя паводле значэння, спосабаў уключэння ў кантэкст, часцінамоўнага выражэння.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Моўныя адзінкі і кантэкст / Э. Д. Блінава, Н. В. Гаўрош, М. Ц. Кавалёва [і інш.]. — Мн. : Выш. шк., 1992. — 271 с.
2. *Гаўрош, Н.* Параўнальныя канструкцыі ў творах нашаніўцаў / Н. Гаўрош, Н. Нямковіч // Роднае слова. — 2011. — № 6. — С. 42—46.
3. *Ляшчынская, В. А.* Слова ў паэзіі Я. Купалы / В. А. Ляшчынская ; нав. рэд. А. У. Падлужны. — Мн. : Бел. навука, 2004. — 272 с.
4. *Купала, Я.* Паэмы. Драматычныя творы / Я. Купала. — Мн. : Маст. літ., 1989. — 494 с.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 15.11.2012 г.



Рэпазіторый БарДУ